Самапомач Самаромаў

Беларуская Кооперацыйна-Гаспадарчая Часопісь

Год III.	Вільня, Ліпень-Жнівень 1934 г.	№ 7-8.

Хай злыдні над намі,
скрыгочуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!..

ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапомаччу.

Джордж РЭСС ЭЛЬ (Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ № 7–8 (24–25)

Ceny ŭ Vilni.

CENY. Zbožža za 100 kilo: 30.VII.34 h.

Žyta I	16.00
Muka pšaničnaja	33.25—36.00
Muka, žytniaja 55 prac.	27.00—27.50
Muka žytniaja 65 prac.	23 00—23 25
Muka žytniaja sitkovaja	18 50—19.00
Muka žytniaja razovaja	18.50—19.00

Małočnaje, 31.VII.34.

Masła najlepšaje, za kilo ŭ hurcie	2.60
" " " " u detalu	3.00
Masła stałovaje za kilo ŭ hurcie	2 40
" " " " u detalu	2 80
Masła salonaje za kilo ŭ hurcie	2.40
" " " " u detalu	2 80
Syr navahradzki, za kilo ŭ hurcie	2.20
" " " " u detalu	2.60
Syr litoŭski, za kilo ŭ hurcie	1.70
" " " " u detalu	2.00
Jajki, kapa	3.60—4 50
" štuka	7—9 hrašoŭ.

Miasny rynak, 31.VII.34 za 1 kilo u hurcie:

Vałovina, całyja štuki	0.60—1.00
" zady	0.80—1.00
" pierady (košer)	0.80—1.20
Cialacina, I hat.	1.00
Svinina	0 90—1.15
Baranina	0 85 -1.00

Hrošy, 31.VII.34.

Łatyski łat	1.41
Litoŭski lit	0.89
Saviecki čyrvoniec	1.25
Rubiel zołatam u 5-cirubloŭcy	4.58
" " u 10-cirubloŭcy	4.60

„Самапомач"

Часопісь выходзіць раз у месяц.

Падпісная плата аднаго экзэмпляра каштуе:

На год	3.— зл.
На паўгода	1.75 „
На 3 месяцы	1.20 „

Заграніцу — ўдвая даражэй.
Цана асобнага нумару 40 грашоў.
Цана абвестак паводле ўмовы.

Коопэратывы, гурткі і прыватныя асобы, што выпісваюць на адзін адрэс найменш 10 экзэмпляраў „Самапомачы" (комплект), плацяць за экзэмпляр толькі 1.20 зл. за 10 экз. 12 зл.

Грошы на «Самапомач» пасылаць на чэкавае конто інж. Клімовіча у П.К О. Nr. 180 485, а ўсякія пісьмы — на адрэс:

Redakcyja „Samapomač", Vilnia, Połackaja vul. 4 - 10
(Wilno, Połocka 4—10).

Рэдакцыя адчынена ў аўторкі і пятніцы ад 9-ай да 11-ай гадз. дня.

Samapomač

BIEŁARUSKAJA KOOPERATYŪNA-HASPADARČAJA ČASOPIŚ.

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Самапомач

Hod III.	Vilnia, Lipień-Žnivień 1934 h.	Nr 8-9 (24-25).

KOOPERATYŪNYJA NAVINY.

Novy paradak apłaty koštaū revizii.

17 traūnia s. h. adbyłosia, pieršaje paśla źmieny kooperatyūnaha zakonu, pasiedžańnie Kooperatyūnaj Rady.

Na hetym pasiedžańni pamiž inšym byli zaćvierdžany novyja praviły apłaty revizii ū niesajuznych kooperatyvach.

Usie kooperatyvy nienaležačyja da Revizyjnych Sajuzaū, pavodle novaha zakonu pavinny kožny hod (raniej było adzin raz u dva hady) być abrevizavany Staršynioju Kooperatyūnaje Rady, praz vyznačanych im revizoraū.

Pačynajučy ad 1 lipnia s. h. za hetkuju reviziju kooperatyvy pavinny płacić Kooperatyūnaj Radzie: 1. stałuju apłatu, vyznačanuju dla kožnaj kooperatyvy na padstavie hadavoj spravazdačy za minuły hod, jakaja pavinna ūnasicca ū roūnych ratach što kvartał nápierad i 2) apłatu samaj revizii — pa 45 złotaū za kožny dzień pracy revidenta ū kooperatyvie.

Stałaja apłata vymierajecca pavodle zysku brutto ūziataha z r-ku zyskaū i strat, a ū kooperatyvach, jakija nie vyjaūlajuć u svaich spravazdačach hetaha r-ku — pavodle balansavaje sumy.

U spažyvieckich kooperatyvach i ū kooperatyvach typu „Rolnik" — zyskam brutto ličycca roźnica pamiž sumaju atrymanaju ad pradažy tavaraū i sumaju vydanaju na kuplu, dastavu i apakavańnie tavaraū.

U kooperatyvach, kredytnych — atrymanyja pracenty, zvaroty handlovych vydatkaū (paštavyja i inšyja) kamisija, damno, roźnica kursu i h. d.

U kooperatyvach vytvorčych — roźnica pamiž sumaju atrymanaju ad pradažy tavaraū ūłasnaha vyrabu i sumaju vyraschadavanaju na kuplu syrca i jaho pierarobku, pry čym handlovyja vydatki, administracyja i pracenty dy kapitał pad uvahu nie biarucca.

Kooperatyvy, ū jakich zysk brutto nie dasiahaje sumy 20,000 zł. ad stałaj apłaty zvalniajucca.

Stałaja apłata ū hod vynosić:

pry zysku brutto ad 2,000 da 3,000 — 60 zł., ad 3,000 da 4,000 — 80 zł., ad 4,000 da 5,000 — 100 zł., ad 5,000 da 7,000 — 140 zł., ad 7,000 da 10,000 — 200 zł., ad 10,000 da 14,000 — 280 zł., ad 14,000 da 20,000 — 400 zł., ad 20,000 da 30,000 — 600 zł. i ad 30.000 da 50,000 — 1,000 zł.

Pry zysku bolšym ad 50,000 zł. — kooperatyvy pavinny płacić 2%.

Adnačasna z rassyłkaju instrukcyi ab paradku abličeńnia stałaj apłaty, vysłany ūva ūsie kooperatyvy zahad ab uniasieńni da 15 lipnia raty za III kvartał s. h., z pahrozaju, što ū razie niaūpłaty ūspomnienaje raty ū vyznačanym terminie, apošniaja budzie spahaniacca praz sekvestrataraū.

Kooperatyvy, jakija byli abrevizavany ū sioletnim hodzie da 1 lipnia i apłacili košty henaje revizii pavodle starych stavak, ad uznosu raty nie zvalniajucca.

Publikacyja abviestak.

Art. 10 kooperatyūnaha zakonu ū novaj redakcyi (Dz. U. R. P, № 55, poz. 495, 27.VI. 1934 h.) vymahaje, kab usie abviestki niesajuznych kooperatyvaū źmiaščalisia ū časopisi vyznačanaj Kooperatyūnaj Radaj, u toj čas jak stary zakon davaū kooperatyvam prava svabodnaha vybaru. Kooperatyūnaja Rada na pasiedžańni svaim dnia 17 traūnia hetkaj časopiśsiu vyznačyła časopiś p. n. «Spólnota Pracy» (Warszawa ul. Marymoncka 3) i ūsie abviestki niesajuznych kooperatyvaū ad 9 traūnia s. h. pavinny źmiaščacca ū hetaj časopisi, niezaležna ad taho jakaja časopiś słužyła dla abviestak pavodle statutu. Cyrkularnym rasparadžeńniem staršyni Kooperatyūnaj Rady ad 30 červienia zaprapanavana ūsim kooperatyvam sklikać da 31 śniežnia s. h. ahulnyja schody i zrabić źmienu adpaviednaho § statutu.

Źmienieny i paradak publikacyi balansu. Kooperatyvy prysyłajuć 2 kopii hadavoj spravazdačy z balansam u Kooperatyūnuju Radu, jakaja apracoūvaje statystyčnyja dadzienyja, układaje balans u adpaviednuju formu i pierasyłaje jaho ū časopiś „Spólnota Pracy" dla abvieščańnia.

Płatu za publikacyju balansu treba ūnosić u Kooperatyūnuju Radu (r-k u Paštovaj Kasie Aščad. — P.K.O. № 30,060).

Za statystyčnuju apracoūku i publikacyju balansu za 1933 hod usim kooperatyvam zahadana ūniaści da 15 lipnia:

a) kooper. volnym ad stałaj apłaty . — 12 zł.
b) „ pry stałaj apłacie mienš. 1000 zł.— 24 „
c) „ „ „ „ bolš 1000 zł. — 40 „

(*Praciah bł. na bač. 62*)

Velkonakupni společnost družstev — V. D. P.

(*1909 — 1934*).

„Od organisované spotreby k vlastni vyrobě“ — ad arhanizavanaha spažyćcia da sobskaha vytvorstva.

Sioleta 1-ha vieraśnia minaje 25 hadoŭ ad taho času, jak pačała svaju pracu Hurtoŭnia českich spažyvieckich (rabotnickich) kooperatyvaŭ, viedamaja siahońnia jak VDP — Velkonakupni společnost družstev. Sama dumka arhanizavańnia hetkaje handlovaje centrali, tahočasnyja varunki pracy, jak i sposaby praviadzieńnia hetaje dumki ŭ žyćcio, nia tolki cikavyja sami praz siabie, ale jany i pavučalnyja. Z ich vidacca jasna, što moža zrabić družnaja ludzkaja vola; navat tady, kali heta robiać biednyja, jak zaŭsiody, ale śviedamyja rabotniki... — Ahułam spatykajecca jšče dumka, što „chto bahaty — toj i razumny“. Voś-ža historyja paŭstańnia i sama praca českaha VDP — heta žyvy dokaz taho, što dabrabyt ludzki rodzicca nie z bahaćcia, a z biedy i razumnaha supracoŭnictva ludziej dobraj voli.

Ale bližej da rečy. Hod 1907/8. Českija spažyvieckija (rabotnickija) kooperatyvy, paśla pieršaha załomu (hladzi «Samapomač» №1/34) pačali nanova arhanizavacca; lik ich u samaj tolki Čechii dasiahaje 100. Isnujuć užo pačatki českaha Sajuzu Kooperatyvaŭ, ale Sajuz hety zajmajecca tolki spravami arhanizacyjnymi. Handlovaha asiarodku českija kooperatyvy nia majuć i abo zaležać ad Hurtoŭni centralnaj u Vienie (aŭstryjackaj) abo ad hurtoŭniaŭ pryvatnych, abo — i heta najhorš! — ad miascovych pierakupščykaŭ. Naturalna, usie blizu kooperatyvy pazałaziŭšy ŭ hetych čužych centralach pa vušy ŭ daŭhi i hetym samym pazbaŭleny elementarnaj svabody ruchaŭ: musiać kuplać tolki ŭ hetych centralach — bo jnakš musili-b zaraz-ža spłačyvać staryja daŭhi i za tavar płacić hatoŭkaj; musiać zdavolicca ichnym taram, jakim-by jon nia byŭ; musiać płacić takuju canu, jakuju padyktuje kupiec-fabrykant-kapitalist, abo čužy — niamiecki kooperatar, jaki ŭ kancy-kancoŭ hladzieŭ na českaha rabotnika taksama jak na teren nacyjanalnaj ekspansyi i sposab nažyvy.

Pry hetkich voś varunkach pačali dum[illegible] českija kooperatary nad sposabami r. p. a y. Vyrašyli, što *„takḃle dale nejde!“* — [illegible] etak dalej nia možna. A ŭ čecha — hetaha typovaha «słavianskaha prusaka» — za słovam idzie čyn uśled.

Ale jak być? Zasnavać hurtoŭniu jak kooperatyvu? — nia možna, bo nizavyja kooperatyvy (1-ha stupnia) uvieś svoj, jaki tolki mieli, kapitał złažyli na rachunak paju ŭ aŭstryjackaj hurtoŭni ŭ Vienie. — Zasnavać hurtuŭniu, jak pryvatnuju supałku z ahraničanaj adkaznaściu? — taksama nia možna, bo tahočasny aŭstryjacki zakon vymahaŭ, kab zakładčyki mieli asnaŭnóha kapitału najmienš 20.000 (dvaccać tysiač) kron.

Jak-ža tady być?.. Uradzili ŭrešcie, što 5 (piać) čałaviek — kooperatyŭnych pracaŭnikoŭ załožać komandytovuju supałku Jaroš i Ko z kapitałam ...500 kron*). Praz miesiac dałučyŭsia supolnik 6-ty taksama z „kapitałam“ 100 kron (40 rubloŭ). Ale i hety kapitał byŭ tolki na papiery, bo hatoŭkaj złažyli zakładčyki tolki 450 kron. Da hetaha pazyčyli na paŭhodu jšče 600 kron i z imi pačali pracavać. Ale jak?

Pastanavili, što buduć na pačatak zakuplivać... siarnički (sierčyki). Z hurtoŭniaj siarničak Schleissner była zroblena adpaviednaja ŭmova, malar-mastak M. Aleš zrabiŭ biaspłatna firmovuju viňjetku na skrynki i pa vulicach Prahi pajechała ručnaja dvukołka, jakaja pačała razvozić da miascovych kramnikaŭ *„Lidové zápalky“*.

Heta byŭ pačatak. Usie pracavali darma, apłačyvaŭsia tolki razvozčyk; dy i to 1-šy hod končyŭsia małym niedaboram, pry ahulnym abarocie niacełych 7.400 kron. Ale pačatak byŭ zrobleny. Treba było da jaho pryprehčy bolš ludziej, a pieradusim isnujučyja ŭžo českija k o o p e r a t y v y. Hety sapraŭdy cikavy mament apisvaje 1-šy dyrektar hurtoŭni pasoł Modraček hetak:

„Byŭ sklikany na dni 27 i 28 červienia 1909 h. sajuzny źjezd, a na druhi punkt paviestki dnia była pastaŭlena „Arhanizacyja Hurtoŭni“. Dziela taho što hurtoŭnia faktyčna ŭžo isnavała, nia treba było havaryć i radzić ab jejnym arhanizavańni, što mahło-b jašče vyklikać biaskoncyja debaty, ale treba było tolki dahavarycca ab finansavańni isnujučaj užo hurtoŭni i handlovaj ŭspamozie z boku kooperatyvaŭ. Chitra zasnavany plan całkom udaŭ-

*) pradvajennaja aŭstryjackaja karona raŭniałasia 40 rasiejskim kapiejkam.

(*Praciaḃ Kooperatyŭnycḃ navin z bač. 61*).

Kooperatyvy, jakija ŭžo apublikavali svoj balans, pavinny da 1 vieraśnia s. h. pierasłać u Kooperatyŭnuju Radu 1 ekzemplar časopisi z abviestkaj.

Adnačasna Staršynia Kooperatyŭnaj Rady zvaročvaje ŭvahu na toje, što nia ŭsie kooperatyvy rejestrujuć u sudzie źmieny svajho statu, składu ŭpravy i inšyja dadzienyja i papiaredziŭ, što za nievykanańnie vymohaŭ zakonu na vinavatych buduć nakładacca kary z art. 121 kooperatyŭnaha zakonu. Kooperatyvy, jakija da hetaha času nia vysyłali ŭ Kooperatyŭnuju Radu kopii spravazdačy za apošni hod i pratakołu ahulnaha schodu, pavinny zrabić heta zaraz pad pahrozaju kar pradbačanych art. 122 kooperatyŭnaha zakonu.

Jašče ab „panskim lohkim chlebie“.

Źmiaščajučy ŭ apošnim numary „Samapomačy“ (№ 6, červień 1934) staćciu p. n. „Pierastańcie dumać ab „panskim lohkim chlebie“!— my zaścierahli sabie prava viarnucca da hetaj spravy jšče raz, moža navat nie adziny. Pryčynaŭ na heta jošć dźvie: niazvyčajnaja važnaść zakranutaha pytańnia i niekatoryja razychodžańni ŭ akančalnych vysnaŭkach.

Prosta ŭdziačnym treba być aŭtoru vyšejnazvanaj staćci za toje, što tak na časie vyciahnuŭ na śviet Božy heta pytańnie i hetym samym zmusiŭ našu biełaruskuju čytajučuju hramadu pryzadumacca nad budučyniaj svajho kraju, svajho zaŭtra. „...My — sapraŭdy — pieražyvajem nia kryzys zvyčajny, jaki ekanamisty nahladali kožnyja niekalki hadoŭ, a pierałomny punkt historyi, punkt, u jakim kapitalistystyčny ład akančalna załamaŭsia, ale novamu ładu miesca jšče ŭstupić nia choča...

„Ideałam novych časaŭ, na miesca daŭniejšaj panskaj biełaručnaści, pahardy da pracy fizyčnaj i žyćcia na čužy rachunak — prychodzie pašana i kult pracy, kožnaj pracy, niahledziačy na toje, ci čałaviek rastrasaje na nivie hnoj, ci kiruje ministerstvam. Na ŭsim śviecie čałaviectva raspranajecca z frakaŭ i krachmalenych saročak i nadziaje rabočuju bluzu“ i h. d. i h. d.

Usio heta slovy „śviatoj praŭdy“, jakija treba było-b vypisać i zamacavać u pamiaci kožnaha dumajučaha biełarusa. Na asnoviedzi hetych słoŭ zusim pravilnym jošć starańnie stvaryć kadry svajej intelihiencyi, jakaja u kraju absadziła-b «placoŭki, što nia viažuć, a prynamsi najmieniej viažuć z łaskaj ci niałaskaj usiemahutnaj čužoj nam administracyi dy dajuć mahčymaść mieć łučnaść z svaim narodam i dla jahonych patrebaŭ pracavać“.

Vychodziačy z hetych voś mierkavańniaŭ, aŭtor staćci „Pierastańcie...“ prychodzić da vyvadu, što biełaruskaja intelihiencyja, jakaja moža vučycca na vyšejšych škołach, pavinna pieradusim kiravacca na medycynu i prava; dla tych-ža ŭznoŭ chto nia moža ŭziacca da pracy biaz „škołnaha patentu“, toj-ža aŭtor prapanuje: kooperacyju, ramiasło i handal. Asobna staić ziemlarobstva, jakoje „całyja viaki ŭ nas budzie haloŭnym zaniatkam“ i dzie dahetul pakutuje jšče niaščasny pahlad, „što byccam nia treba aśviety, kab być ziemlarobam, što škada navuki, kali treba varočacca da baćki na rodnuju nivu“.

Paŭtareńnie i adśviažeńnie ŭ pamiaci hetych dumak było kanieśnym z uvahi na doŭhi čas pamiž vychadam u śviet paasobnych numaroŭ „Samapomačy“ i na patrebu zachavańnia całaści snavanaj dumki. Da skazanaha ŭvažajem adnak za kanieśnaje dadać nastupnaje:

Na kolki zhadžajemsia z charakterystykaj sučasnaha stanu, na stolki admienny majem pahlad na šlachi, kudoju šukać vychadu. Praŭda, što intelihiencyja škiravanaja na takija addziełу, jak medycyna, zabiaśpiečvaje siabie ŭ žyćci, ale nia možna hetaha ćvierdžańnia ŭahulniać. Nia možna zamykać vačej na toje, što ŭžo siahońnia siarod lekaraŭ adčuvajecca biezraboćcie(!); praŭda, nie zaŭsiody dzieła taho, što ŭsiudy husta nasadžanyja ŭ nas placoŭki sanitarnyja, a dzieła taho, što pryvatnaja pomač lekarskaja šyrokim kruhom nasielnictva niedastupnaja, a źbiurakratyzavanyja „chvoryja kasy“ — heta-ž často nie lačeńnie, a ...nu Boh iz imi. A paśla — kolki moža być takich lekaraŭ, što asieŭšy na vioscy, akramia vypichańnia kišeniaŭ, pry najlepšaj navat voli mahli-b, ci lepš — umieli-b uziacca za pracu hramadzkuju; i to pracu nie pabahasłaŭlenuju „silnymi mira sieho“?.. To-ž siahońnia ŭžo nie sakret, što jošć takija biełaruskija lekary, što vyšaŭšy navat z „Biel. Stud. Sajuzu“ i asieŭšy na biełaruskaj vioscy bajacca ci stydajucca hutaryć pabiełarusku. Tymbolš inšyja fachi, „zaležnyja“.

Praŭnikі!.. Praŭda, u nas jašče tolki nabiižajecca para narodnych abaroncaŭ — advakataŭ, adyhraŭšych i dahetul adyhryvajučych hetak vydatnuju rol u adradžeńni napr. ukrainskaha narodu. Ale ci-ž kožny praŭnik moža stacca advakatam? Inšyja-ž haliny pracy praŭnikaŭ: u administracyi, u sudoch—dla biełarusaŭ pry sučasnych paradkach buduć tak doŭha niedastupnymi, jak doŭha biełarusy buduć... biełarusami.

Dla ŭvypukleńnia značeńnia ziemlarobskaj aśviety treba abaviazkava zaznačyć, što najpilniejšym zadańniem biełaruskaha intelihienta-

---

sia. Delehaty, prymaŭšyja ŭčaście ŭ sajuznym źjezdzie, adnahałosna pryniali prapanavanyja rezalucyi ab finansavańni i handlovaj dapamozie novaj hurtoŭni, a za dva miesiacy paśla źjezdu (1 vieraśnia 1909) pačała ŭžo „Rabotnickaja supałka dzieła vytvorstva i zakupaŭ“ svoj rehularny handal z sajuznymi kooperatyvami“.

Pieršyja paru hadoŭ praca jšła ciažka; pačalisia spadziavanyja padkopy z boku jak pryvatnych handlaroŭ, tak i centralnaj hurtoŭni ŭ Vienie. V.D.P. adnak užo stała na svaje nohi. U 1912 h. V.D.P. była pieramienienа na supałku z ahraničanaj adkaznaściu i raźvićcio jaje pajšło, možna skazać, niastrymanym tempam. Siahońnia V.D.P. rachujecca najbolšaj kooperatyŭnaj placoŭkaj svajho rodu ŭ całaj Čechasłavaččynie. Vidać heta choć-by z taho, kali paraŭnujem 7.400 kron abarotnaha kapitału 1909 h. z 60.000.000 kron pajavoha i rezervovaha kapitału ŭ kancy 1933 h. Jejnaje vytvorstva za toj-ža 1933 h. mieła canu 137 miljonaŭ kron.

Hetaha zdolna dakazać achviarnaja praca ludziej navat biednych ale družnych.

A. K.

pracaŭnika na hetym poli jość znajšci **sposab zastasavańnia** ŭsich vynachadaŭ techniki ŭ drobnaj sialanskaj haspadarcy.

Maŭčkom paminienaja hrupa pracaŭnikoŭ na nivie biełaruskaj škoły i aśviety naahuł — heta-ž ułaścivyja ŭzhadavaŭcy budučaha pakaleńnia. Inšaja reč, što praca ichnaja moža siahońnia najhorš honorujecca. Skłalisia na heta pryčyny vonkavyja, ale nie biaz viny i samyja pracaŭniki, što nie starajucca vynajšci sposabaŭ pracy mahčymych da realizacyi i pry siańniašnich varunkach. Nia majem, praŭda, školaŭ, ale ci-ž u nas vykarystana navučańnie zavočnaje?

Niama zacikaŭleńnia? — a chto-ž jaho pavinien vyklikać?..

Niama srodkaŭ, — ale-ž, nie abražajučy tut pačcivych ramieśnikaŭ, t v o r č y duch sapraŭdnaj intelihiencyi heta ž nie šaviecki ci stalarski stanok. Chto-ž, kali nie intelihiencyja— ŭrodžanaja ci nabytaja — musić vykrasić utojenyja ŭ narodzie siły, niedastupnyja dla intelihiencyi nasłanaj, čužoj?! A hetyja siły ŭ narodzie jość!

I kolki jość usich takich halin pracy jašče zusim nie pačatych, abo znachodziačychsia tolki ŭ zarodku! A ŭsio heta składajecca na całaść usienarodnaha žyćcia, usio musić być pačynanym ad samaha pačatku. Biaz hetaha žyćcio naša ŭ zarodku samym užo było-b vykryŭlenym, adnabokim, kalekim.

Dyk ci moža być mova ab šablonnym nakiroŭvańni padrastajučaha pakaleńnia na „medycynu i prava"? Dumajem, što nie! Užo samaje ŭnutranaje nastaŭleńnie kandydata i jahonyja pryrodžanyja zdolnaści havorać proci hetaha. Zamiest šablonnaha nastaŭleńnia badaj bolš pravamernym budzie rádzić kandydatam prad vybaram taje ci inšaje haliny pracy, paradzicca z tym čałaviekam, katory ŭ hetaj halinie ŭžo pracuje ci skul-niebudź jaje znaje. Usie haliny pracy nam patrebnyja, bo nia vypracuje nam medyk našaj historyi ci literatury, najlepšy advakat nie zapoŭnić dziŭnaha ŭ nas niedastatku ludziej sceny, muzyki, ahranomy nia buduć nikoli architektami i h. d. Słovam, kožny chaj prabivajecca tudy, kudy maje paciah, a hałoŭnaje — na što adčuvaje **zdolnaść, siłu**. Usie jany znojduć pole pracy, kali tolki sapraŭdy zachočuć pracavać, a nia buduć čakać na „pasady".

Pry ŭsim hetym treba źviarnuć uvahu na adnu reč: padrastajučyja kandydaty intelihientnych pracaŭnikoŭ patrabujuć apieki staršaha hramadzianstva, heta praŭda. Ale heta apieka nia śmieje pieraradžacca ŭ cackańnie, paturańnie i što horš jašče — ŭ kuplańnie: z hetak vyhadavanych „oranžeryjnym" sposabam pracaŭnikoŭ tołku budzie mała, jany ŭ žyćci załomiacca i zhinuć. Chaj idzie moładź na jakija choča addziely pracy, jej treba dać **ćviordy biełaruski chrybiot**, a t.dy jana nidzie i nikoli nia zhubicca. Užo z školnaj łaŭki pryzvyčaivać treba moładź da pracy hramadzkaj, hetaj pracy ad jaje v y m a h a ć.

Chto-ž u hetyja „ahłobli" nia choča ŭprehčysia za moładu, admaŭlajučysia navukaj, toj u budučyni znojdzie vymoŭku dla svajej karjery i ŭsio roŭna astaniecca paza radami pracaŭnikoŭ narodnych, hramadzkich. Na hetki element škada najmienšaj achviary.

Najlepšaj-ža školaj hramadzkaha žyćcia jość k o o p e r a c y j a. *Red.*

Dzie kapać studniu, kab natrapić na vadu.

Pytańnie heta staralisia ludzi vyrašyć ad daŭnych časaŭ. Da siahońnia adnak niama na heta sposabaŭ peŭnych. Jość tolki bolš ci mienš praŭdapadobnyja dahadki, jakija raz apraŭdyvajucca, inšy-ž raz zusim da ničoha nie davodziać. My siahońnia, nažal, nia majem taksama na heta sposabu novaha. Na vyraznuju adnak i z niekalkich miascoŭ paŭtaranuju prośbu našych pavažanych čytačoŭ, paŭtarajem tut spaściarohi ludziej-praktykaŭ, drukavanyja ŭžo ŭ biełaruskaj literatury, nie biaručy za skutkoŭnaść ich nijakaje adkaznaści.

I tak, chto maje sioletni (1934) „Biełaruski Adryŭny Kalendar", toj nia moh chiba nie zaŭvažyć u im dnia 30 traŭnia nastupnaj rady jak šukać vady:

Na ačyščanaj ad dziarna ziamli rasścilajuć aŭčynu voŭnaj uvierch: pasiarod aŭčyny kładziecca śviežaje kurynaje jajko, jakoje nakryvajecca novym hlinianym harškom. Robiać heta viečaram, u suchuju pahodu i kali ziamla źvierchu byvaje suchaja. Nazaŭtra ranicaj pryhladajucca. Kali pad harškom voŭna na aŭčynie i jajko pakrylisia rasoj, to heta značyć, što tutaka napeŭna jość vada i prytym niahłybaka. Kali jajko suchoje, a voŭna vilhotnaja — vada hłybaka. Kali ŭsio suchoje — dyk vady zusim niama.

Hetulki ŭ nazvanym kalendary. Sposab hety možna było-b vytłumačyć susim naturalnym paradkam. Inakš pradstaŭlajecca sprava z hetak zvanaj „Čaradziejskaj rozačkaj studniakopaŭ", ab katoraj Dr. Z—ič svajho času pisaŭ u „Bieł. Krynicy" (№ 15/27 h.) miž inšym hetak:

„Rozačka moža być z dzierava zvyčajnaha (harešnika), z fišbinu, z drotu stalnoha. Fišbinu možna lohka ŭ kramach i ŭ nas dastać. Možna ŭziać dźvie rozhi (dva dubčyki), daŭžynioj 20—25 centymetraŭ, šyrynioj pał. centymetra. Adny kancy viazać, za druhija trymać paasobku rukami, tak, što vyjdzie forma viłak. Kali lohkaja, trymać tolki palcami, kali ciažkaja — całymi žmieniami zaŭsiody tak, kab adnosna da ziamli ruki (palcy) byli źvierchu. Znača nie na dałoniach trymać, ale dałoni da ziamli abiarnuć.

Niekatoryja navat zamiest rozački ŭžyvajuć majatnika, kivača — vałaviany horb (abo dzieraviany) na kanaplanym šnuročku 15 cent. daŭžynioj. — Rozačka padnosicca abo apadaje,

Сельская гаспадарка.

За сярпом плуг.

Сёлетняя сухамень (суша) праз цэлую вясну ясна паказала цану вогкасьці ў глебе. Гэта вогкасьць можа мець два жаролы, з каторых яна паходзіць; імі зьяўляюцца: вогкасьць атмосфэрычная (дождж, сьнег) і вогкасьць самой глебы. На збольшаньне ці зьменшаньне колькасьці атмосфэрычнай вогкасьці чалавек дагэтуль не знайшоў спосабу. Інакш затое стаіць справа з тэй вогкасьцю, якая паходзіць з самой глебы: тут чалавек можа да пэўнай меры запасы гэтай вогкасьці пабольшыць ці паменшыць. Рабіць гэта можна пры помачы доўгатрывалых, раз даражэйшых, іншы раз танейшых мэліорацый (штучнае асуш:ньне або заліваньне).

Але і штодзеннае абрабляньне глебы звычайнай гаспадарскай снасьцю (плугом, бараною) мае за заданьне, між іншым, таксама р э г у л я в а н ь н е вогкасьці ў глебе. Выразна кажам „рэгуляваньне,“ бо пры такой напр. ворцы ці баранаваньні ніскуль ня прыводзіцца вада новая, і нікуды спэцыяльна не адводзіцца вогкасьць у глебе ўжо існуючыя. Ворка і баранаваньне толькі гаспадарацъ тэй вогкасьцю, якая ў глебе ўжо знаходзіцца ды і то пераважна ў тым сэнсе, што **ашчаджаюць яе ў пару сухамені.** Аднэй з найважнейшых такіх ворак, ёсьць плыткая ворка ўсякага аржышча з а р а з-ж а пасьля зьняцьця з поля збожжа. Гэткая ворка, акрамя таго што ашчаджае ў глебе вогкасьць, гэтак цэнную асабліва для засеву пасьляжніўных кармавых мяшанак, важна яшчэ і тым, што яна:

1. раскладае прыаранае пад ральлёю аржышча, якое там гніе, вытварае газы, каторыя спульхняюць самую глебу;

2. само аржышча, будучы прыараным, становіцца гноем, каторы прападае дарма, калі гэта аржышча астанецца непрыараным;

3. заaранае поле здолее заўсяды больш выкарыстаць дажджавую ваду, якая ў заарaную глебе лягчэй упіваецца і якая па незаараным аржышчы лёгка сплывае ў ручаі і рэкі;

4. урэшце мелкае (плыткае) заворываньне аржышча зараз-жа пасьля прыбраньня з яго збожжа дае магчымасьць нішчыць шматлікае пустазельле растучае і выцерушанае на дадзеным полі. Справа ў тым, што сьвежавыцерушанае насеньне пустазельля мае звычайна йшчэ вельмі ценькую луску і дзеля таго дастаўшыся ў сьвежа заараную ральлю даволі скора і лёгка ўсходзіць; узышоўшае ж пустазельле можна выбаранаваць і гэтым самым зьнішчыць.—Калі-ж выцерушанае насеньне ўсякага зельля не дастанецца ў сьвежа заараную ральлю і астанецца даўжэйшы час ляжаць на паверхні аржышча незааранага, тады луска гэтага насеньня, пад уплывам сонца і паветра грубее, цьвярдзее і дастаўшыся ў зямлю можа ляжаць там

---

a kivač jak u hadziňniku pasoŭvajecca — abo napierad abo nazad. — Kivač rajać trymać na vyšyni vačej, a rozačku pierad saboj. — Najlepš upatrablać abodvuch chodziačy, a kali stajać pa miescy, to treba mianiać pazycyju ruk. Blizu kožny čałaviek moža być tut aparatam. Adrazu nia treba zražacca. Časami rozačka jakiś čas astajecca biaz ruchu, a tolki paśla mnohich probaŭ pačynaje padnosicca abo apuskacca — niezaležna ad voli ludzkoj — viedama-ž treba vielmi vyścierahacaa aŭtasugiestyi, abo, jak u nas kažuć, puskańnia sabie tumanu ŭ vočy.., Dobra kab było pry hetym niekalki asob. Chaj adzin chto nosić, a inšyja hladziać.

Vada, jak viedama, pływie pad ziamloj na roznaj hłybini karytami roznaj šyryni. Zaležyć heta ad hruntu, ad jaho słajoŭ i h. d. Znajomaść hetaha dajuć nam geologija i geografija. Toj, chto choča kapać, ci viarcieć studniu, musić daviedacca, u jakim miescy jość vada, jak šyroka i hłyboka. Voś tut rozačka i pamoža nam spaznać hetu šyryniu i hłybiniu.

Spacyrujma-ž z jeju, trymajučy za dva kancy (kali maje formu jak-by vilak), a adzin kaniec (špic) vysunuŭšy napierad pierad saboju. Usiu rozačku treba trymać nia stoć a pazioma (haryzantalna) — z troški prypadniatym špicam u vierch. Spacyrujma pa hetym hruncie, dzie majem studniu kapać. Kali rozačka nahła, niezaležna ad nas, *padymiecca ŭvierch*, heta znača, što jość vada. Zaznačma nahoj, abo kałočkam hetaje miesca j adstupiŭšy trochi pasoŭvajmasia pamału jaki šah naprava ci naleva ad hetaha miesca. Rozačka znoŭ padnosicca. Naznačma i pracujma dalej — hetak vyznačym sabie adzin bierah vadzianoha karyta, jakim biažyć vada. A ciapier da druhoha, katory, zvyčajna, jość roŭnabočny da pieršaha, My jaho najdziem idučy prostapadna (perpendzikularna) da pieršaj linii. Aznačma to-ž kałočkami i budziem mieć karyta padziemnaj reki.

Majučy tak aznačanaje rečyšča vady, idziom uzad prostapadna (perpiendzikularna) da katoraha-niebudź bierahu. U peŭnym momancie rozačka dryhanie i *spuścicca ŭniz.* Aznačma hetaje miesca i źmierma dałokaść ad bierahu i budziem mieć mierku hłybini vady.

Jak bačym, treba aryjentavacca, katoryja ruchi najpierš pajaviacca — ŭvierch ci ŭniz.“

Перад сяўбой азімінаў.

Яшчэ пару тыдняў і прыходзіць час сяўбы азімінаў. Сее чалавек па тое, каб мець ураджай і каб гэты ўраджай быў добры. А на гэта трэба: добра вырабіць глебу, добра яе пагнаіць і пастарацца д о б р а г а і здаровага насеньня (сяўбы). Мінаючы тут пытаньні што да абрабленьня і пагнаеньня глебы, затрымаемся крыху над пытаньнем падбору і прыгатаваньня самай сяўбы (насеньня): толькі з добрага і здаровага насеньня можна спадзявацца добрага ўраджаю. Добраякаснае насеньне мусіць быць:

1. с а п р а ў д н ы м, г. зн. тым, за якое яго набываем;

2. ч ы с т ы м ад усякіх дамешкаў іншага збожжа, а таксама ўсякага жвіру, сьмяцьця і г. п.;

3. у с х о д л і в ы м: з сотні зярнят добрага насеньня, засееных у вогкую глебу, або на прамочаную сушку, павінна прарасьці да 95 зярнят;

4. в а ж к і м — гэктолітр (сто літраў) жыта павінен важыць 68—77 клг., пшаніцы—70—80 клг., ячменю — 68—75 клг., аўса — 40—57 клг.;

5. ц э л ы м — непаламаным, непацёртым і йнакш непакалечаным;

6. з д а р о в ы м — г. зн. ня толькі само ў сабе, але ня сьмее мець ніякіх заразных зародкаў на сваей паверхні.

Гэтыя ўласьцівасьці можа мець насеньнд ўсякага сорту. Найвыразьней аднак выступаюць яны ў насеньні гэтак званым заводным; тут яны выступаюць з найбольшай сілай. На вялікі жаль аднак выбар заводнага насеньня таксама часта вядзе да непаразуменьняў, бо людзі пры гэтым найчасьцей глядзяць і цэняць толькі адзін бок мядалю: яны загледжаны толькі ў само насеньне як такое і зусім ня цікавяцца тым, чаго такое насеньне патрабуе ад прыроды (глеба, клімат) і ад самога земляроба (спосаб выробленьня глебы, ейнага пагнаеньня, самага пасеву). Хто гэтак аднабока глядзіць на справу, той найлепшае нават насеньне можа змарнаваць. Дзеля гэтага перш чым закупліваць заводнае насеньне, трэба парадзіцца з тым, хто гэта насеньне знае (сусед, агроном); а калі гэтага насеньня ніхто ў ваколіцы яшчэ ня знае, тады прад выпісваньнем яго трэба даведацца, якой зямлі і якога догляду яно патрабуе і купляць толькі такое, якое расьце і добра разьвіваецца ў варунках горшых, чым мы яму можам у сябе забясьпечыць. Можна купляць насеньне, якое расьце ў такіх самых варунках як нашы, але высьцерагацца трэба такога, якое гадавалася ў варунках лепшых; напр. ня можна купляць сяўбы з краінаў чорназёмных, з раньняй вясной, умяркаваным летам, познай восеньню, лёгкай зімой і перасаджываць яе на пяскох, пры познай вясьне, гарачым леце (суха!), раньняй восені і суровай зіме. Практычна бяручы рэч, высьцерагацца трэба сартоў насеньня выгадаванага на поўдзень ад нас і заўсяды бесьпячней купляць такое насеньне, якое выгадавана на поўнач ад нашай ваколіцы.

Варочаючыся йшчэ да здаровасьці насеньня, як варунку добрай ураджайнасьці, трэба зазначыць, што ніколі ня можна быць пэўным здаровасьці найлепшага нават насеньня; у сярэдзіне можа яно быць і здаровым, але покуль дойдзе да рук таго гаспадара, каторы яго будзе сеіць, дык надта лёгка можа набавіцца розных хваробаў. Зародкі гэтых хваробаў сядзяць моцна прыляпіўшыся на вонкавай лусцэ зярняці і зараз-жа нападуць на расток, як толькі ён праб'е луску.

Дзеля гэта разумны і рупны гаспадар кожную сяўбу з-гары ўжо рахуе затручанай і перш чым яе засяваць, стараецца ачысьціць ад успомненых хваробных зародкаў. Спосабаў на гэта ёсьць шмат.

Насамперш думалі людзі, што досыць будзе, калі такую сяўбу абмыць у звычайнай вадзе. Хутка аднак паказалася, што зародкі хваробы часта так моцна прылепліваюцца і нават упіваюцца ў зерне, што аб адмыцьці іх ня можа быць мовы ды што самае толькі намачэньне зярняцьці ў звычайнай вадзе замест шкодзіць — памагае хваробнаму зародку ў час разьвіцца і тады з цэлай сілай нападаць на разапрэўшае зерне. Гэта змусіла чалавека прамываць сяўбовае насеньне ня ў звычайнай, чыстай вадзе, але да вады гэтай дадаць яшчэ якой-небудзь дамешкі, каторая ня шкодзілі б зярняці як такому, але забівала-б (затрувала-б) прыліпшыя да зярняці хваробныя зародкі. Дзеля гэтага і сама чыннасьць гэткага прадпасеўнага прамываньня зярняці стала называцца з а т р у в а н ь н е м (толькі не зярняці а зародку хваробы), або пачужамоўнаму — б а й ц а в а н ь н е м.

Сягоньня ўсе спосабы байцаваньня дзелім на дзьве аснаўныя групы: байцаваньне м о к р а е (старэйшае) і с у х о е (навейшае).

Байцаваньне м о к р а е палягае на тым, што сама атрута распускаецца ў вадзе, у каторай пасьля прамываецца сяўбовае насеньне. Пры байцаваньні-ж сухім, атрутны парашок перамешываецца з сяўбовым насеньнем на с у х а. Да байцаваньня мокрага як атруты для хваробных заразкаў ужываюць сіня-

непашкоджанае, быццам законсэрваванае, цэлымі гадамі і „раптам“ абыйсьці якраз тады, калі гэтага гаспадар найменш спадзяецца. Страты з гэтага могуць быць вялікія.

Дык не марнуйма магчымасьці ашчадна гаспадарыць цэннаю глебаваю вогкасьцю і старанна заворывайма аржышча зараз-жа, як толькі яно ўвольніцца ад збожжа.

С. Я.

га каменя, формаліны, сублімату, сумысных мяшанак гермізану, устулюну, а да сухога ўжываецца г. зв. зярняк.

Сіні камень (медзяны купарас) прыгатаўляецца аднапрацэнтны: на сто літраў вады даецца адзін кілёграм купарасу. Лепш распусьціць купарас спачатку ў меншай колькасьці гарачай вады і пасьля даліць гэта да рэшты вады ў дзераўляным цэбры ці якой дзежцы, так жа дзераўлянай. Гэтых 100 літраў разьведзенага купарасу можа хапіць на байцаваньне 300—400 кілёграмаў сяўбовага насеньня. — Само байцаваньне выглядае так: бяром густы кошык, для пэўнасьці высьцелены чыстым палатном, насыпаем у яго насеньне і, затопліваючы ў растворы купарасу, старанна вымешваем праз 5 мінут. Усплываючае наверх сьмяцьцё зьбіраем і спаліваем (атрута!). Па пяцёх мінутах кош з насеньнем выбіраем, старанна прапаласківаем у дзяжы з чыстай вадой і рассьцілаем ценькім пластом на чыстым таку (лепш на падлозе) ў гумне ці ў іншым правеўным месцы, часта яго пры гэтым пераварачваючы (шуфлюючы). Праз дзень-два насеньне ўжо можа быць гатовым да севу.

Каб прабайцаванае насеньне ўсьцерагчы ад паўторнага заражэньня, трэба месца сушкі спачатку скрапіць тым-жа растворам купарасу, змачыць у ім і пасьля высушыць мяшкі, у каторыя сяўбовае насеньне будзе набірацца да севу; таксама ўсякую снасьць, з якою байцаванае насеньне будзе стыкацца перш чым дастанецца ў глебу (лапаты, лубкі, сеялкі), трэба прад кожным ужыцьцём змачыць растворам таго-ж самага купарасу.

Формаліна—раствор 0.1 прац. (на 100 літраў вады $^1/_4$ літра прадажнай 40 прац. формаліны. Байцаваньне трывае 20 мінут. Рэшта як пры м. купарасе.

Сублімат—0.1 прац. раствор (1 грам на 1 літр вады). Насеньне ў ім не затопліваецца, а толькі спырсківаецца. На 100 кілё насеньня выходзіць 15 кілё раствору. Сушыць досыць поўгадзіны.

Гермізан (Germisan) ужываецца ў 0.25 прац. (чверць працэнтным) растворы. На 100 літраў вады даецца 250 грамаў ($^1/_4$ кілё) парашку. Байцуецца 30 мінут. Аднэй порцыі раствору хапае на 300 кілё сяўбы.

Успулюн ўжываецца таксама ў 0.25 прац. растворы. Рэшта як у гермізану, толькі успулюн мацнейшы і аднэй порцыі (250гр.) хапае на 400—500 кілё сяўбы.

Сухое байцаваньне палягае на тым, што сяўбовае насеньне перамешываецца з парашком байцу на суха. Ужываюцца да гэтага парашкі сухога успулюну, агавіту і апошнім часам успомнены ужо зярняк. Перамешываньне адбываецца ў шчыльна замкнёнай кадушцы, якую найлепш прыгатаваць так, каб круцілася навокал укоснай васі. На 100 кілё сяўбовага насеньня выходзіць 150

Сейце зімовую выку!

Штораз выразьней становіцца, што нават пры сучасным абясцэньваньні ўсей землябробскай вытворчасьці, у дробнай асабліва гаспадарцы карова была, ёсьць і астанецца ня толькі жывіцелькай беспасярэдняй, але і адзінай бадай крыніцай дробных, можна сказаць — штодзенных даходаў земляроба, на ягоны зварот. Бяда толькі ў тым найчасьцей, што наш гаспадар мае досыць малака тады іменна, як яно таннае, а вясной (м-цы травень—чэрвень), калі малако мае цану, яго звычайна няма. Чаму? Бо селянін наш у гэту пару ня мае для каровы пашы.

Вось-жа дзеля выпрадукаваньня адпаведнай колькасьці добрай вясьнянай пашы, у нашых варунках найбольш прыгодная мяшанка азімай выкі (касматай, званай *vicia villosa*) з жытам або пшаніцай. Гэта мяшанка дае пашу ўжо ў першых днёх м-ца траўня (мая) і далей. Вымаганьні азімай выкі вельмі скромныя. Удаецца яна на ўсякай глебе, з выключэньнем, натуральна, сыпучых пяскоў; не баіцца нават глебаў мерна падмоклых. Натуральным варункам ураджайнасьці зімовай выкі, як і кожнай пасьляжніўнай мяшанкі, ёсьць дастатак атмосфэрычных вопадзяў (дажджу) у пару прарастаньня (м-цы: жнівень-верасень). У нас на гэта жаліцца звычайна на можна.

У гаспадарчым севазвароце азімая выка звычайна прыходзіць на поле пасьля жыта, ячменю, а таксама пасьля раней выкапанай бульбы.

Пры засяваньні выкі важна тое, каб выпрадукаваць як найбольшую колькасьць зялёнай расьціннай масы: дае гэта шмат корму, а ў глебе, апрача набранага з паветра азоту, пакідае йшчэ вялікую масу карэньняў, якія таксама перапрэваюць на цэнны гной.

Прыгатоўваць глебу трэба зараз-жа пасьля зьняцьця першай зьмены — мелка ўзараць аржышча. Калі ёсьць якая магчымасьць

грамаў парашку успулюну (на суха) ці агавіту. Байцаваньне на суха трывае 5—7 мінут.

Выгоды байцаваньня на суха перад байцаваньнем на мокра наступныя:

байцаваньне на суха ня нішчыць параненага зярняці,

няма небясьпекі пратрыманьня сяўбы ў растворы,

насеньне зараз-жа можа быць высеена (ня трэба сушыць) і

бароніць ад зародкаў хваробы ня толькі тых, якія ўжо знаходзяцца на зярняці самым, але і ад тых, з якімі можа спаткацца ў заражанай глебе: зерне байцаванае на суха прыходзіць у зямлю ў ценькай павалоцы парашку, каторы яго бароніць ад усякіх хваробных зародкаў.

А. К.

пагнаіць поле пад азімую выку штучнымі гнаямі, дык адплаціцца гэта напэўна. На гэктар даецца 400 кілё каініту і 200—300 тамасшляку. На цяжэйшых грунтох замест гэтага лепш даць адпаведную (меншую) колькасьць паташавай солі і супэрфосфару. Гэтыя пагноі можна даць ужо на аржышча і пасьля прыараць. Але лепш будзе, калі рассеіць пагноі на аржышчы ўзараным і пасьля прыбаранаваць. У гэтым апошнім выпадку патрэбна йшчэ другая прадпасеўная ворка—мешань.

З сяўбой ня можна сьцягіваць. Выка пасееная сама звычайна палягае і таму ёй трэба даць апірышча, усейваючы ў яе жыта або пшаніцу. Толькі ўзноў увага: выкі ня можна сеіць адначасна з жытам ці пшаніцай, бо яна расьце значна вальней і таму магла-б заглохнуць. Дзеля таго выку трэба сеіць асобна і раней, а жыта таксама асобна і пазьней, цераз тыдні 2—4 пасьля выкі. На гэктар высейваецца каля 60 кілё выкі і каля 50 кілё жыта або 60 кілё пшаніцы. Гэта на той выпадак, калі сеецца сеялкай. Калі ж сеецца на „шырока“ (з рукі), тады трэба сеіць гусьцей, прыблізна па 100 кілё выкі і 100 кілё жыта (ці пшаніцы) на га. Жыта дамешваецца, калі хочам мець мяшанку ранейшую; пшаніцу-ж, калі мяшанка мае быць пазьнейшая. Акрамя таго, каб вырасшая мяшанка была ўсьцяж сочнай, маладой, яе ня можна і ня трэба сеіць усю за раз, а толькі па часьцях, як яе думаем зьбіраць.

Пачынаць сеіць выку трэба ўжо ў палове м-ца жніўня. Пры сяўбе сеялкай радок ад радка даецца на 20—25 см. Усейваючы пасьля жыта, трэба яго даваць у радкі паміж радкамі абыйшойшай ўжо да таго часу выкі. Пры сяўбе з рукі засееную выку і жыта (пшаніцу) прыбараноўваем цяжкой рэдкай бараной. Па сеялцы хопіць даць лёгкую барану.

Набываючы насеньне выкі заўсяды трэба запэўніцца ейнаю усходлівасьцю, бо з гэтага найчасьцей бываюць страты.

С. Я.

Сухоты (тубэркулёза).

Гэта хронічная заразная хвароба выклікаецца спэцыфічным бацылам, якога у 1882 г. аб'явіў Кох. Творыць яна спачатку ў мускульных тканках малюсенькае лагво ў форме сальнай крупінкі, шэрай, празрыстай, якая пасьля з сярэдзіны распадаецца ў мелка крупністую масу. Гэтыя дробныя крупінкі могуць узноў зьліцца ў адну большую, каторыя ў сваю чаргу могуць тварыць большыя ці меншыя падзіны (поласьці), напоўненыя сьлізам, матэрыяй. На сьлізістых балонках усіх ворганаў творацца няправільнай формы верады з напохшымі берагамі. Гэтыя тубэркулёзныя логвы могуць звапнець і тады хвароба сама сабой мінае. Бактэрыі сухотаў (тубэркулёзы) могуць аднак крывёй быць перанесены ў іншыя мясцы (ныркі, вым'я, косьці) і гэтым выклікаць агульную хворасьць.

Зародкі сухотаў могуць спатыкаццца ўва ўсякіх выдзяленьнях з хворага цела, напр. у выдыханым паветры, у сьліне, у харкацінах, у вытоках з носу, у малацэ, у мачы, у сяменьні і г. д. Зараза паўстае або ў насьледзтве ад хворых на сухоты бацькоў, або заражэньнем (гэты спосаб у жывёлы часьцейшы).

Сухоты з заражэньня паўстаюць: а) пры кармленьні (асабліва маладняка сырым малаком), б) пры даўжэйшым прабываньні хворай на сухоты жывёлы з здаровай удыханьнем заражанага паветра. Пачаткавым месцам заражэньня на сухоты бываюць звычайна органы дыханьня або траўленьня, хоць ня выключана і заражэньне скуры. Заражаюцца сухотамі перадусім: скаціна, сьвіня і каза, радзей ужо авечка, а йшчэ менш конь, сабака, кот і хатнія птушкі. Сухоты жывёлы могуць быць перанесены і на чалавека.

Ня ўсе аднак расы скаціны аднолькава падкія на сухоты, нізінная скаціна больш падкая ад горскай; а штукі тэй-жа расы хутчэй хварэюць, калі з іншых якіх прычын бываюць аслаблены.

Сухоты скаціны.

Істота і пашырэньне.

Бактэрыі сухотаў выклікаюць на тых органах, дзе засядуць, усялякія наросты і верадавітыя зьмены. Разрозьніваюць сухоты адкрытыя, якія ў скаціны можна пазнаць ужо зьверху; зародкі хваробы выходзяць з цела (напр. пры высока разьвітай тубэркулёзе вым'я, радзільных органаў, чэрава). Закрытыя або ўтоеныя сухоты абмежываюцца на ўнутраныя ворганы (сюды належаць сухоты лёгкіх, пакуль ейныя логвы не распадуцца ў дыхальныя трубкі). Пры адкрытай форме сухотаў зараза пераносіцца проста з жывёлы хворай на здаровую. Гэткія выпадкі сухотаў трэба паведамляць вэтэрынарным уладам, каторыя абавязаны іх нішчыць. Здаровая жывёла заражаецца, акрамя ўдыханьня, яшчэ зьяданьнем сырога малака або малочных адпадкаў (поснае малако, масьлянка, кал, які астанецца з малака на цэнтрыфугах і сыраватка) ад кароў церпячых на сухоты вым'я; гэткім спосабам можна перанесьці сухоты ня толькі на цяляты і сьвіні, але і на чалавека.

Прыметы за жыва.

Прыметы відомай формы сухотаў розныя, залежна ад таго, які орган сухотамі нападзены.

Відома распазнавальныя сухоты лёгкіх вызначаюцца кашлем, спачатку рэдкім, хоць

сільным і поўным, пасьля густым але слабым, нявыразным. Адначасна зьяўляецца расстройства органаў страўляючых. Вока траціць сваю жывасьць, поўсьць перастае быць бліскучай і становіцца шорсткай, скура цьвярдзее, траціць элястычнасьць (цягучасьць) і з трудом даецца адцягнуць пальцамі ад падскурных мускулаў. Часьцей таксама здараецца надыманьне бяз відомай прычыны.

Пры відома распазнавальнай форме сухотаў вым'я, адна ці некалькі частак (чвёртак) яго, выглядае разбракшым, цьвёрдым але бяз болю і бяз звышанай тэмпэратуры, але малако для звычайнага вока не паказвае ніякіх зьмен. Замест раўнамернага набракненьня цэлых чвёртак, бываюць часам толькі адзіночныя цьвёдыя, бязбольныя крупіны і шышкі (наросты) ў сярэдзіне вым'я, каторыя асабліва добра даюцца распазнаць (вышчупаць) пальцамі ў вым'і выдаеным. Скаціна спачатку ня худае, але з часам прыйдзе і на гэта.

Карова хворая на сухоты радзільных органаў часта ўздымаецца на валы, з похвы бяз прычыны выдзяляецца выцёк, быццам пры заразным катары або пры ськівданьні. Выцёку бывае звычайна шмат, на выгляд ён сьлізіста-гнойны і бяз запаху.

Азнакай адкрытых сухотаў чэрава, якія спатыкаюцца рэдка, зьяўляецца развальненьне бяз відомай прычыны; гэта развальненьне не даецца вылечыць звычайнымі лекамі, адначасна заўважваецца значнае расстройства ўсяго страўнага апарату.

Таксама пры гэтых формах сухотаў вока хворай скаціны можа страціць сваю жывасьць, поўсьць становіцца бяслесклай і шурпатай, а скура — цьвёрдай, нерасьцяжнай. Адна штука скаціны можа мець дзьве і больш з гэтых формаў сухотаў.

У забітай жывёлы знаходзяць звычайна сухоты лёгкіх; акрамя таго — сухоты грудной і брушной перапоны (пэрлавіна), страўнага каналу, печані, радзей ужо сухоты вым'я, нырак, селязёнкі і касьці.

Др. Ю. З.

Чырвонка ў сьвіней.

Істота хваробы і пашырэньне.

Зараза гэта выклікана спэцыфічным (сумысным) быцылам чырвонкі, праходзіць скора і з значнымі агульнымі комплікацыямі. Асобная ўмяркаваная форма чырвонкі ёсьць г. зв. крапіўная гарачка, пры каторай на брусе, на хрыбце, на шыі, на вушах і на сьцёгнах жывёлы зьяўляюцца чатырохкутныя чырвоныя гарачыя плямы, бляднеючыя ад сярэдзіны да берагоў. Прычына хваробы знаходзіцца ў крыві; пры чырвонцы крапіўнай толькі ў хворых часьцях скуры. Хворая жывёла выдзяляе іх з калам з мачой. Калі пры забіцьці хворай жывёлы кроў няўважна саб- рана, спырскваецца ёй зямля, у каторую дастануцца і самыя бацылы хваробы. Заражаецца жывёла заражаным кормам і пойлай, рыцьцём у зямлі заражанай мачой, калам, крывёй ці якімі іншымі адпадкамі хворай жывёлы. Дзеля таго небясьпечным ёсьць кармленьне жывёлы купленай з бойні крывёй, мясам і іншымі адпадкамі або памыямі з тыхжа бойняў. Бацылы чырвонкі, выйшаўшы тым ці іншым спосабам з цела хворай жывёлы, асабліва шыбка разьвіваюцца пры цёплай пагодзе; таму чырвонка гэтак небясьпечная ўлетку.

Прыметы за жыва.

Заражаная бацылам чырвонкі жывёла пачынае хварэць праз 2—3 дні; у яе аб'яўляецца высокая гарачка (41—42.8°C), падымаецца цяплыня скуры, траціцца ахвота да ежы, становіцца непаваротнай: многа ляжыць, залазіць у салому (у падсьцілку), а ўзагнаная—ідзе сланяючыся на бакі. На скуры хутка зьяўяцца чатырохкутныя чырвоныя плямы. Чырвонасьць скуры хутка пашыраецца і ўзмацняецца, так што пры даўжэйшым трываньні хваробы жывёла на сподняй часьці цела становіцца ўся чырвонай аж сінячырвонай. Без спэцыяльнага лячэньня ў большасьці выпадкаў хвароба канчаецца сьмерцю.

У некаторых выпадках чырваненьне пашыранае бывае не на цэлае цела, але абмежавана на большыя ці меншыя чатырохкутныя мясцы, якія пасьля напухаюць, так што усё хворае месца падымаецца; гэткая форма чырвонкі называецца крапіўнай і звычайна канчыцца выздараўленьнем.

Прыметы пасьмертныя.

У сьвіней паўшых ад чырвонкі, акрамя чырвонасьці скуры, спатыкаецца запаленьне сьлізістых балонак трыбуха і чэрава (кішок), селязёнка напохшая, колеру сінячырвонага, таксама напохшая печань і крывавае запаленьне нырак.

Кожны выпадак чырвонкі як хваробы і ўстанаўленьне ейных прыметаў за жыва ці па сьмерці павінен быць азнаймлены вэтэрынарным уладам, а ўласьнік такой жывёлы павінен, аж да ўрадавага сьцьверджаньня хваробы, аддзяліць хворую жывёлу, каб зараза не перанасілася на жывёлу здаровую. З стады хворай жывёлы без вэтэрынарнага абсьледаваньня ня можа быць праданай ніводная штука.

Шчапеньне і іншыя процізаразныя сродкі.

Шчапеньне проці чырвонкі сяньня так удасканалена, што даець блізу поўнае забесьпячэньне і дзеля таго ў мясцовасьцях, дзе чырвонка аб'яўляецца, трэба йшчэ з вясны ўсіх сьвіней шчапіць. У кожным аднак разе трэба шчапіць усіх сьвіней там, дзе за-

Калі і як зьбіраць садовіну?

Практычныя садаводы падлічылі, што на найлепшым нават дрэве ня бывае больш добрай садовіны (яблыка, ігрушка і г. д.) як палова ўсяго ўраджаю; найчасьцей аднак з дзесяцёх штук усякай садовіны бывае добрых толькі дзьве-тры. Гэта паказвае, што кожную такую „добрую“ штуку трэба асабліва старанна сабраць і перахаваць. Тады толькі садаводзтва і аплачываецца.

Аб тым, калі і як зьбіраць найчасьцей спатыканую ў нас садовіну, пісала „Самапомач“ год таму назад (глядзі № 11, бач. 66—67, 1933 г.). Дзеля таго агранічымся тут да мамэнтаў толькі некаторых, адсылаючы ў рэшце пытаньняў да вышэйпададзенага артыкулу.

Летнія яблыкі і асабліва йгрушкі ня можна цалком сьпяліць на дрэве, бо страцяць сачыстасьць і стануцца мучнатымі: іх трэба здымаць за тыдзень — паўтара і болей перад уласьцівай (фізіолёгічнай) сьпеласьцю. Дасьпяваньне яблыка на дрэве пазнаецца па тым, што зялёная скурка ягоная пачынае лёгка жаўцець, а зярнё—звычайна бранзовага колеру—мяняе яго на чорны. Натуральна, што мова тут аб яблыку зусім здаровым і нечарвівым, бо гэты апошні сьпее значна хутчэй. Сьпелая садовіна трымаецца на галінцы лёгка і спадае ўжо пры лёгкім устрасеньню.

Восеньскія сарты яблыкаў трэба здымаць таксама перад іхнай поўнай сьпеласьцю, як толькі заўважым лёгкае пажаўценьне скуркі плада, што знаходзіцца на абводзе кароны дрэва. У звычайныя гады пара гэта прыпадае на час паміж 20-тым верасьнем і 10-тым кастрычнікам.

Найцяжэй устанавіць пару збору садовіны зімавой. А мае гэта вялікае значэньне на перахаваньне яе праз круглы год. Кажуць, што чым пазьней вісяць такія сарты садовіны на дрэве, тым лепшы пасьля даюць тавар. Нават малы раньні прымаразак (ня ніжэй — 2°С) ня шкодзіць яблыку на дрэве, а толькі памагае ягонаму сьпяленьню.

А цяпер „як зьбіраць садовіну?“

Аб „трасеньні“ садоў можна сказаць адно — гэта перажытак барбарыства. А гэта з дзьвюх прычын: калечацца гэтым пладаносныя галінкі дрэваў, а самі плады, хоць-бы яны вырасьлі на дрэве найлепшымі, найпрыгажэйшымі—раптам і беспаваротна трацяць характар тавару рынковага... Вось-жа зьбіраць садовіну трэба ў пагодныя дні, пасьля таго як ранішняя раса абсохне і да часу, калі вячэрняя ўзноў зьявіцца. Калі б днём прайшоў дождж, дык трэба пачакаць з зборам, пакуль абвеіць. Зьбіраць найлепш рукой, якая добра вычувае, які яблык ужо прыгодны да збору, а які йшчэ мусіць астацца на дрэве. Пачынаць збср трэба зьнізу і з вонкавага боку кароны дрэва, ступнёва падымаючыся ўверх і ўглыбку (да камля). Пры перакладаньні і пераношаньні трэба з рыначнымі пладамі ня меншай асьцярожнасьці, чым з... яйкамі, бо кожны націск ці то пальцам (асабліва — пазногцем) ці якім іншым спосабам калечыць плод беспаваротна.

Сабраныя плады трэба ўсьцяж мецць на воку, перабіраць, сартаваць і г. д. Але аб гэтым наступным разам. **В. Р.**

раза чырвонкі ўжо аб'явілася. Нават у хворай ўжо жывелі ісчапеньне ня раз памагло.

Чырвонка не спатыкаецца там, дзе сьвіні трымаюцца ў суху і дзе самыя хлявы для іх (сьвінчыкі) час ад часу дакладна вычысьцяцца і дэзынфікуюцца. **Др. Ю. З.**

Сок з агрэсту бяз цукру.

Перахоўваецца доўгія гады. Можна з яго прыгатаўляць розныя сокі, галярэты, або ўжываць на кісель, да гарбаты і г. д. Прыгатаўляецца гэтак:

Агрэст зьбіраецца, калі ён ужо добра вырас, але яшчэ цьвёрды. Сабраныя гэтак ягады або расьціраюцца, або хутка перапускаюцца праз машынку да рассяканьня мяса на катлеты. Хутка трэба перапускаць дзеля таго, што сок, стыкаючыся з сталёвымі часьцямі машынкі цямнее і нават чарнее, а да таго — набірае паху і смаку па жалезе, што, натуральна, да прыемнасьці не належа. Самую машынку пасьля перагнаньня такога соку трэба таксама старанна вымыць, бо таксама чарнее.

Так ці гэтак расьцёртыя ягады агрэсту зьбіраюцца ў добра паліваны гаршчок і трымаюцца там праз 12 гадзін часу, а пасьля ўкладаюцца ў звычайны палатняны сырнік і выціскаюцца; пры гэтым сок узноў ня можа стыкацца ані з смольнымі дошкамі, ані з жалезам.

Выцісьнены сок зьліваецца ў вялікія шкляныя слаі, абвязваецца зьверху грубой, але чыстай (незадрукаванай, ані запісанай) паперай і пакідаецца праз 6 (шэсьць)тыдняў на сонечным вакне. У гэтым часе сок павінен „выкляравацца“ (зрабіцца празрыстым); тады яго асьцярожна пераліваюць у начыньне другое, а як там састаіцца — зьліваюць у бутэлькі, у каторыя для лепшага паху ўкідаецца йшчэ па кавалку чыстай, цытрынавай скуркі. Скурка гэта мусіць быць добра ачышчана ад белага мякіша.

Гэтак прыгатаваны і разьліты ў бутэлькі агрэставы сок старанна каркуецца. Корак, які ня сьмее датыкацца самога соку, заліваецца лякам, воскам або парафінай. Бутэлькі пасьля выносяцца ў халаднавае месца (ў склеп), стаўляюцца ўверх дном і могуць там перахоўвацца цэлымі гадамі.

Добры агрэставы сок зусім добра замяняе дарагі прывозны сок цытрынавы.

Ц. В.

Сьпяленьне мёду.

Добры мёд толькі тады, калі ён у пару высьпеляны. Мёд, які з якой-небудзь прычыны ня быў высьпеляны, бывае нятрывалкім, кісьне і аканчальна псуецца. Нясьпеласьць мёду залежа ад таго, што ў ім за шмат бывае вады (больш 20 проц.) Навонках такі (нясьпелы) мёд мае крыху зелянаваты колер, выглядае мутным і звычайна ня сцукроўваецца. Сьпелы мёд у вульлі тады толькі, як ён ужо пачаў засклеплівацца і як ён не выцякае з рамкі пахіленай укосна пад кутом 45⁰.

Сьпяленьне мёду мае за заданьне адабраць лішнюю ваду. Робяць гэта ў вульлі самі пчолы — сьпяленьне натуральнае. Калі-ж чалавек пасьпяшыцца выбраць з вульля мёд перш, чымся пчала пасьпее яго высьпяліць, тады гэту работу каля сьпяленьня мусіць зрабіць сам чалавек.

Натуральнае сьпяленьне мёду адбываецца ў вульлі. Пчолы падчас мёдазбору ня маюць адпачынку нават і ўночы, яны бязупынна лятаюць каля мядовых чарачак і дрыжэньнем сваіх крыльляў прыводзяць у шыбкі рух усё паветра ў вульлі. Ад гэтага выпароўваецца з мёду лішняя вада і ён сьпее.

Штучнае сьпяленьне мёду мае тоесамае заданьне — адпароўваньне з мёду лішняй вады. Таму сьвежа выбраны мёд, асабліва ў пару самага мёдазбору (м-ц чэрвень ліпень) ня можна зьліваць у вузкія і высокія пасудзіны, але наадварот—у шырокія і плыткія (мелкія). Пасудзіны-ж гэтыя ня трэба і нават ня можна зачыняць (закарковываць) на глуха, але трэба прыкрыць толькі чыстай палатнянай прыкрыўкай. Гэтак прыгатаваныя судзіны з мёдам трэба паставіць абавязкава ў сухое, па магчымасьці ў правеўнае месца. Хто мае больш такога мёду да сьпяленьня, можа дзеля гэтага выкарыстаць звычайнае сонечнае цяпло. Але найлепш напоўненыя гэтак судзіны з мёдам паставіць на вышкі чардак пад страху) будынку крытага бляхай. У гэткім месцы, як ведама, днём бывае вельмі цёпла, а ўночы ўсё астывае: ад гэтага мёд ня толькі хутка траціць ваду (сьпее), але і цукруецца. Пры малой колькасьці мёду (адзін-два збанкі) яго ставяць на вакно ў хаце.

Калі-б узноў нейдзе так сталася—а бывае гэта, на жаль, вельмі часта і густа, — што сьвежа выбраны мёд усё-ж ня высьпее і пачне фермэнтавацца, тады таксама ня трэба складаць рук і рахаваць што ўсё страчана. Не! Тады трэба толькі гэткі мёд пераварыць. Але, ўвага! Ня можна гэтага рабіць проста на вагні. На вагонь ставіцца якісь большы рондаль ці гаршчок да палавіны напоўнены вадой і ў гэту ваду толькі ўстаўляецца судзіна з мёдам. Цяплыня падаграванай вады перадаецца мёду і ён пачынае варыцца. Пры гэтым на мёдзе ўздымаецца пена, якую трэба старанна і да чыста здымаць, аж пакуль гэтай пены ня стане. Але вышэй 60⁰С падаграваць ня можна.

Гэтак сама падаграваюць мёд сцукраваны, калі хочуць яго пералажыць заднае судзіны ў другую — з большае ў некалькі меншых ці наадварот.

Міх. Чар—скі.

Лек ад укушэньня камароў, пчол, мух

Укушэньне камара і пчалы перастае сьвярбець і балець, калі ўкушанае месца зараз-жа пашмаруецца калёньскай вадой, камфоравым сьпіртам або аммоніякам (нашатырам). Ня можна пры гэтым трымаць жала ў ране, а зараз-жа выцягнуць—рукамі, шчыпчыкамі або так выцісньуць, як выціскаюць вугры. Калі-б жала ня можна было выбраць, трэба цела вокал ранкі ціскаць старанна, каб стуль вышла кроў, з каторай выйдзе і пчаліны яд.

Укушэньне павука бывае труючым і месца ўкусу трэба змываць соленай вадой або воцтам.

Мясцы пакусаныя камарамі найлепш змываць вадой, у каторай распушчаны алун, дадана 2 лыжкі воцту і 1 лыжка гліцэрыны.

Каб укушанае месца перастала пяршэць, радзяць яшчэ:

а) пасыпаць яго тоўчаным бульбяным крахмалам, або

б) добра намыліць мылам, або

в) прылажыць лістком цыбулі, або—найлепш— нацёрці хлёроформам.

Ц.

Гарачая вада як сродак проці шкоднікаў на хатніх вазонах

Тэмпэратура 50⁰С ня шкодзіць расьцінам, калі дзеіць ня доўгі час —3—5 мінут,— але шкодзіць і забівае ў гэты ж час усіх шкоднікаў на вазонах, якія гінуць часта ўжо пры 40–45⁰С, калі ня маюць сумыснага панцыра. Гэта-ж вада шкодзіць аднак і на карэньні вазоннай расьціны.

Вось-жа гэту ўласьцівасьць гарачай вады можна выкарыстаць на тое, каб абараніць вазоны ад розныякіх шкоднікаў. Дзеля гэтага вазон нападзены мшыцай, або чырвоным павуком затопліваецца (перавернены ўверх дном) пароўна карэньня у гарачую ваду на 3—5 мінут. Тэмпэратуру 40–50⁰С трэба добра вымерыць тэрмомэтрам, бо пры вышэйшай як 50⁰С тэмпэратуры гіне і сама вазонная расьцінка.

Вялікія вазоны, каторыя трудна было-б затопліваць у судзіне з вадой, трэба паліваць такой-жа гарачай вадой з палівачкі

Як зьбіраць і прыгатаўляць грыбы.

(*Працяг, гл. „Самапомач“ № 6*).

Баравікі найчасьцей спатыканыя маюць корань белы, або белаваты (корань ніколі ня мае колеру чырвонага ці жоўтага), шапачка цёмная, спод шапачкі, калі баравік малады — белы, а калі стары - то бледна-жоўты і зялёны, а калі нажом перарэжым корань, то сярэдзіна будзе белай.

а) Зьбіраньне. Баравікі растуць ад месяца травеня (мая) да позна восені. Зьбіраючы баравікі вялікія, нажом сьцінаем корань каля самае зямлі; меншыя-ж грыбы — асьцярожна трэба вырваць, ня псуючы г. зв. падземных каранёў грыбоў. Маленькія грыбкі больш прыгодны на марынаваньне і кансэрваваньне і дзеля гэтага зьбіраючы грыбы аддзяляйма іх ад большых, ачышчаючы корань іх ад бруду. Баравікі большыя і здаровыя, каторыя маем сушыць, трэба чысьценька перабраць і корань абрэзаць, пакідаючы найбольш 3—4 см. даўжыні.

Баравікі „жаўтакі“ (спод шапачкі жоўты) маюць ніжэйшую якасьць і ня можна іх тады мяшаць з праўдзівымі баравікамі.

б) Сушэньне. Сушыць баравікі можна на сонцы, у печах і ў адпаведна зробленых сушарнях. Сушачы баравікі на сонцы трэба нізаць іх на шнур даўжынёю 1 мэтра, асобна „жаўтакі,“ асобна грыбы белыя з карэньнямі даўжынёю да 3—4 см., асобна грыбы белыя з карэньнямі даўжынёю да 2 см., і наканец асобна белыя шапачкі, бо яны розьняцца паміж сабой што да якасьці. Ніжачы баравікі трэба ўважаць, каб пасярэдзіне шнурка знаходзіліся грыбы з шапачкамі большымі, а да канцоў зьбліжаючыся — шапачкі павінны быць меншыя і галоўкі павінны быць зьвернены ў сярэдзіну шнурка. Зьвязаныя шнуркі з грыбамі твораць вянкі, каторыя будуць сохнуць на месцы правеўным, высокім, на сонцы, завешаныя на чыстых пруткох.

У нас звычайна грыбы сушаць у печах, а мала знаюць іншыя спосабы сушэньня. Сушачы ў печах, трэба палажыць воддаль грыб ад грыбка, на блясе ацынкаванай або на сетках (толькі не на аржавых). Ізноў і тут трэба глядзець, каб не перапаліць ці не памяшаць з попелам. Калі ў печы грыбы ня высахлі, то ў вышэй сказаны спосаб можна падсушыць на сонцы.

в) Сартаваньне. Мы вельмі мала зварочываем увагу на сартаваньне грыбоў і мяшаем грыбы з карэньнямі і даўгімі карэньнямі, старыя з маладымі, ніжачы усё на адзін вянок. А з гэтага выходзіць толькі страта, бо скупшчык дае шмат горшую плату за іх. Сартаваць баравікі трэба гэтак: 1) Шапачкі баравікоў з белым сподам, без карэньняў — гэта найлепшы і найдаражэйшы сорт сушаных баравікоў, здаровых, неперапаленых, з шапачкамі адзінакавай велічы. 2) Баравікі з белым сподам шапачкі і з карэньнямі даўжынёю да 2 см. 3) Баравікі з сподам шапачак белым, карэньнямі даўжынёю 3—4 см., галоўкі могуць быць тут трохі ўшкоджанымі і перасушанымі. 4) „Жаўтакі“ з карэньнямі—гэта нізкі гатунак. 5) Карэньне баравікоў.

г) Апакаваньне сушаных баравікоў. Грыбы да сушэньня нанізваюцца на шнуркі даўжынёю 1 мэтра, у форме вянкоў. Сушаныя на шнурках грыбы ня варта перанізываць (хіба ёсьць грыбы перапаленыя ці паламаныя). Тыя грыбы, што сохлі кожны паасобку, будзем нізаць на вянок.

Кожны вянок—гэта асобны гатунак і дзеля гэтага не мяшайма разам розныя сарты. Запаковываць грыбы трэба ў чыстыя кошыкі ці карзінкі высланыя чыстай, незадрукаванай паперай. У мяшкох высылаць баравікі ня можна, бо грыбы пры гэтым крышацца.

д) Пераховываньне сушаных баравікоў. Сушаныя баравікі перад высылкай павінны пераховывацца ў чыстым, сухім і магчыма правеўным мейсцы. Вянкі найлепей развесіць на пруток.

Гэтак сабраны і дагледжаны грыб заўсёды лепш аплаціць самога сябе.

Ю. Б.

праз вельмі густое сіта. Але, ўвага! Ня можна так паліваць, каб вада з вазону сплывала на карэньні, бо гэта шкодзіла-б ім і цэламу вазону: вазон трэба палажыць над нейкай большай судзіной і так паліваць, каб вада сплывала ўбок.

Ц.

Гаспадарчая хроніка.

1—шы кірмаш на футры і футраныя вырабы ў Вільні арганізуецца ў міжчасе ад 18 жніўня да 9 верасьня сёл. На кірмашы будуць прадстаўніцтвы ўсіх фабрык краёвых, з Польшчы і з заграніцы. Між іншым запэўнена ўчасьце савецкіх (расейскіх) фірмаў. Вартасьць іхных экспонатаў аблічаецца на 100.000.000 рублёў.

Агранамічны Аддзел пры Віленскім Унівэрсытэце загрожаны. Згодна з весткамі прэсы, Міністэрства асьветы забараніла прымаць запісы на 1-шы курс Агранамічнага Аддзелу Віленскага Унівэрсытэту. Азначае гэта павольнае касаваньне цэлага Аддзелу і край наш узноў астанецца бяз вышэйшай школьнай пляцоўкі.

Можа-б так падумалі ўрэшце аб заснаваньні ў нас сярэдняй школы гаспадарчай?

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ

Bielaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1—3.

Наша пошта

В. Д—скі: Ад 1-га ліпня сёл. ўвайшоў у сілу закон з 27.X.33 г., паводле якога „уласьнік жывёлы або той, хто жывёлай карыстаецца, цалком адказны за шкоду, якую яна зрабіла, незалежна ад таго ці яна была пад яго наглядам, ці заблудзіла або ўцякла..." Злоўленую ў шкодзе жывёлу маеце права „забіраць у хлеў" (да нядаўна гэта было скасавана) і дамагацца, нават судова, адшкадаваньня на падставе расцэнкі зробленай солтысам і панятымі (сьведкамі).

Б. Ба—іч: хто-б у нас гадаваў люцэрну — ня ведаем. Радзім Вам аднак на вясьняную пашу спрабаваць сеіць мешанку зімовай (касматай) выкі з жытам. Прачытаеце аб гэтым больш у стацьці „Сейце зімовую выку!" у сяньняшнім нумары „Самапомачы."

Ст. Хар—к: Будзе ўжо хіба позна. Кажуць аднак, што мурашкі ня любяць нафталіны і калі ёй пасыпаць мурашнік, дык з яго ўцякуць. Папрабуйце! Але шкоды, аб якіх пішаце, бадай ня будуць ад мурашак, бо яны гэтак ня шкодзяць.

Б. С—ка: „Самапомач" выходзіць ужо трэці год, стала, раз у месяц. Ад 1-га красавіка пабольшыла свой разьмер. Аб дальшым пабольшаньні будзем думаць, калі часопісь у гэтай форме станецца самаставальнаю (самастарчальнаю) Прызнаём, што яна за малая. Але такая часопісь, якія ейныя чытачы: як лік чытачоў пабольшыцца, пабольшыцца і разьмер часопісі. Пробны нумар пасылаем. Спадзяёмся, што зьберыце падпіску на дзесяць экзэмпляраў (12 злотаў).

М. Н—віч і А. А—ая: Пробныя нумары „Самапомачы" высылаем. Дальшыя пасылаць будзем толькі па атрыманьні падпіскі

В. В: Вы, здаецца, асабліва любіце „пробныя" нумары, бо паводле нашых зацемак пасылаем Вам ужо гэткі „пробны" нумар трэці раз; але ўжо і апошні. Дальш будзем высылаць толькі па атрыманьні падпіскі.

Л. Т—ка і П. Б—віч: Адказ Вам ідзе асобнымі пісьмамі.

Каса Стэфчыка ў Жодзішках. Да Вашага камплекту далучаецца йшчэ адзін экзэмпляр для Фр. Бабка ў Пільцях.

УВАГА! *УВАГА!*

Ад наступнага нумару пачынаючы, пры рэдакцыі «Самапомачы» ўводзіцца аддзел праўных парадаў, якія будзе весьці безінтэрэсоўна беларуская адвакацкая сіла. Асобы, якія маюць якіясь пытаньні, павінны іх ясна і выразна напісаць на пісьме і прыслаць у нашу рэдакцыю. Адказы — невялікія будуць друкавацца ў «Самапомачы». На адказы большыя трэба далучыць паштовую марку за 30 грашоў.

Рэдакцыя
„САМАПОМАЧЫ"

Pierasyłka apłačana ryčałtam.



CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ